**22.** Дадзены словы:

*1) паджаць; 2) саджанец; 3) паджарка; 4) дажджы; 5) джынсы.*

У якіх словах спалучэнне літар ***дж*** абазначае два гукі?

**А)** усе словы. **Б)** няма патрэбных слоў. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 5.

---

**23.** Якія з дадзеных слоў напісаны правільна?

*1) сякунда; 2) завязь; 3) дробезь; 4) кефір; 5) лягенда.*

**А)** усе словы. **Б)** няма патрэбных слоў. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 5.

---

**24.** Выберыце з дадзеных словы, у якіх пяць літар і шэсць гукаў.

*1) Вілія; 2) Друць; 3) Шчара; 4) Барок.*

**А)** усе словы. **Б)** няма патрэбных слоў. **В)** толькі 1. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

---

**25.** Вызначце словы, напісаныя няправільна.

*1) прыязджаць; 2) стушка; 3) перапішчык; 4) беспрытульны.*

**А)** усе словы. **Б)** няма патрэбных слоў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

---

**26.** У якіх словах з дадзеных на месцы пропуску напішаце літару ***е***?

*1) куп..; 2) кашн..; 3) пік..; 4) камюнік.. .*

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** няма патрэбных слоў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

---

**27.** Ганчары спрадвеку рабілі з гліны посуд, ткачы ткалі з ільняных і ваўняных нітак тканіны. Краўцы шылі адзенне, а шаўцы – абутак. А што выраблялі гарбары?

**А)** скуры. **Б)** караблі. **В)** высякалі з цвёрдага каменю жорны.
**Г)** майстравалі стулы. **Д)** рабілі шпакоўні.

---

**28.** У 1844-1846 гадах быў выдадзены празаічны зборнік “Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях”, аўтарам якога з’яўляецца … .

**А)** Адам Міцкевіч. **Б)** Ян Баршчэўскі. **В)** Янка Журба.
**Г)** Ігнат Буйніцкі. **Д)** Вацлаў Ластоўскі.

---

**29.** У народзе калі-нікалі можна пачуць: *“Сямі пядзяў у лбе”*. Гэты выраз засноўваецца на прыёме гіпербалы: *сем пядзяў* – гэта амаль … .

**А)** дваццаць сантыметраў. **Б)** паўметра. **В)** адзін метр.
**Г)** паўтара метра. **Д)** два метры.

---

**30.** У фалькларыстыцы гэты мастацкі прыём гумарыстычнага апавядання, небыліцы (наўмыснае парушэнне лагічнай сувязі ў адлюстраванні падзей, у паслядоўнасці разгортвання сюжэта, паказе жыццёвага шляху чалавека з мэтай камічнага эфекту) называецца … .

**А)** алагізм. **Б)** алегорыя. **В)** гіпербала. **Г)** алітэрацыя. **Д)** алюзія.

---

Конкурс арганізаваны і праводзіцца Грамадскім аб’яднаннем «Беларуская асацыяцыя «Конкурс» сумесна з Акадэміяй паслядыпломнай адукацыі пры падтрымцы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

220045, г. Мінск, вул. Яна Чачота, 16 тэл. (017) 372 36 17, 372 36 23
e-mail: info@bakonkurs.by http://www.bakonkurs.by/

ГА «БА «Конкурс». Заказ 13. Тыраж 26000 экз. г. Мінск. 2019 г.

# Конкурс па беларускай мове
# «БУСЛІК-2019»

*Чацвер, 21 лютага 2019 года*

- працягласць работы над заданнем 1 гадзіна 15 хвілін;
- карыстацца падручнікамі, канспектамі, справачнай літаратурай і электроннымі сродкамі забараняецца;
- кожны правільны адказ адзначаецца трыма, чатырма ці пяццю баламі; колькасць балаў, якія атрымлівае ўдзельнік, адказваючы на пытанне правільна, вызначаецца складанасцю пытання (10 лягчэйшых пытанняў – па 3 балы, 10 найбольш складаных – па 5 балаў, астатнія 10 – па 4 балы); складанасць пытання вызначаецца па колькасці ўдзельнікаў, якія правільна на яго адказалі;
- няправільны адказ адзначаецца чвэрцю балаў, прадугледжаных за дадзенае пытанне, і залічваецца са знакам «мінус», у той час, як не даўшы адказу, удзельнік захоўвае раней набраныя балы;
- на кожнае пытанне маецца толькі адзін правільны адказ;
- на старце ўдзельнік атрымлівае авансам 30 балаў;
- максімальная колькасць балаў, якую можа атрымаць удзельнік конкурсу, – 150, аднак аўтары задання не прадугледжваюць яго поўнага выканання ўдзельнікамі. У заданне гульні-конкурсу ўключаны пытанні, веды пра якія не прадугледжаны школьнай праграмай;
- самастойная і сумленная работа над заданнем – галоўнае патрабаванне арганізатараў да ўдзельнікаў конкурсу; пры парушэнні гэтых патрабаванняў удзельнікі могуць быць дыскваліфікаваны;
- пасля заканчэння конкурсу лісток з заданнем і чарнавік удзельнік забірае з сабой;
- вынікі ўдзельнікаў размяшчаюцца на сайце http://www.bakonkurs.by/ праз 1,5-2 месяцы пасля правядзення конкурсу.

---

## Заданне для вучняў 7-8 класаў

**1.** Падчас народнага свята Каляды па дварах і хатах з песнямі хадзілі калядоўшчыкі, вадзілі з сабой Казу і спявалі:

*Дзе каза рогам,*
*Там жыта…*

Якое слова прапушчана?

**А)** стогам. **Б)** не расце. **В)** на страсе. **Г)** у хляве. **Д)** ва́лам.

---

**2.** Адгадайце народную загадку.

*Белыя кветачкі ўвечар квітнеюць, а ранкам вянуць.*

**А)** рамонкі. **Б)** лотаць. **В)** зоркі. **Г)** маргарыткі. **Д)** сняжынкі.

---

**3.** Вызначце аўтараў літаратурных казак:

*1) “Каліф-бусел”; 2) “Дванаццаць лебедзяў”; 3) “Нямоглы бацька”.*

*а) У. Караткевіч; б) Г. Х. Андэрсан; в) К. Гаўфт.*

**А)** 1-а, 2-б, 3-в. **Б)** 1-б, 2-а, 3-в. **В)** 1-в, 2-а, 3-б.
**Г)** 1-в, 2-б, 3-а. **Д)** 1-а. 2-в, 3-б.

---

**4.** Гэта міфалагічная істота, па народных павер’ях, вельмі любіла ездзіць на соме. Таму ў народзе самоў і не любілі ўжываць у ежу. Хто гэта?

**А)** лясун. **Б)** балотнік. **В)** вадзянік. **Г)** дамавік. **Д)** баннік.

**5.** Слова “маргарытка” ў перакладзе з грэчаскай мовы – жамчужына. І на самой справе, калі ўважліва паглядзець, кветачка ў нечым мае падабенства да жамчужыны. У Беларусі гэту кветку яшчэ называюць … .
**А)** ружа. **Б)** стакротка. **В)** сон-трава. **Г)** фіялка. **Д)** дзьмухавец.

---

**6.** Палярнай зоркай захапляліся ва ўсе часы паэты і пісьменнікі. Шмат легенд перадавалася з вуснаў у вусны. А як раней беларусы называлі Палярную зорку?
**А)** Галактыка. **Б)** Валасы Веранікі. **В)** Нябесны Кол.
**Г)** Каляда. **Д)** Дракон.

---

**7.** У краінах Заходняй Еўропы доўгі час трымалася мода на бабровыя капелюшы, якія называліся … .
**А)** касторавымі. **Б)** вяльможнымі. **В)** недасяжнымі.
**Г)** напудранымі. **Д)** надзейнымі.

---

**8.** Вызначце правільна напісанае слова.
**А)** зацьменне. **Б)** затменне. **В)** зацменне. **Г)** зацьменье. **Д)** зацменье.

---

**9.** У многіх народных песнях *“краснае сонца”* сімвалізуе …, *“ясны месяц”* – …, а *“зорачка”* – … . Выберыце правільны парадак слоў, якіх не хапае на месцы пропуску.
**А)** радасць, смутак, пяшчоту. **Б)** лета, зіму, вясну.
**В)** гаспадыню, гаспадара, дзяўчыну. **Г)** дзяўчыну, хлопца, вяселле.
**Д)** Вялікдзень, Каляды, Купалле.

---

**10.** Якія навукі з прыведзеных вывучаюць міфалогію? Выберыце патрэбныя варыянты:
*1) этнаграфія; 2) мастацтвазнаўства; 3) лінгвістыка; 4) філасофія.*
**А)** усе варыянты. **Б)** няма патрэбных варыянтаў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

---

**11.** Якое слова прапушчана ў вершаваных радках Максіма Танка?
*А глянеш навокал – такая краіна:*
*Дзе ступіш – то рэха, то казка, … .*
**А)** прыказка. **Б)** песня. **В)** быліна. **Г)** загадка. **Д)** гісторыя.

---

**12.** У народзе існуе прыкмета:
*Калі ў верасні лісце на дрэвах трымаецца моцна – зіма будзе … .*
**А)** ранняя. **Б)** позняя. **В)** доўгая. **Г)** дажджлівая. **Д)** шумная.

---

**13.** Якой часцінай мовы з’яўляецца выдзеленае слова ў вершаваных радках Г. Бураўкіна?
*Пад булькатанне ручаёў*
*Спяшаюць* ***нацянькі***
*Да сонных вёсак і гаёў*
*Вясновыя дзянькі.*
**А)** назоўнікам. **Б)** прыметнікам. **В)** дзеясловам.
**Г)** прыслоўем. **Д)** займеннікам.

---

**14.** Якое значэнне мае ўстойлівае спалучэнне *за дзедам шведам*?
**А)** зусім не простая справа.
**Б)** штосьці прывабнае, спакуслівае, але недазволенае.
**В)** лёгка і хутка перамагчы каго-небудзь.
**Г)** вельмі даўно.
**Д)** вельмі далёка.

---

**15.** Як пісаў у свой час мовазнавец Ф.М. Янкоўскі, “гадзюка мае здольнасць падымацца і кідацца на чалавека, на любую жывую істоту”. У выніку пераносу дзеяння, стану гадзюкі на чалавека і ўтварыўся фразеалагізм … са значэннем ‘пагрозліва, варожа ставіцца да каго-небудзь’.
**А)** на хвост станавіцца. **Б)** на ўсю іванаўскую.
**В)** наступаць на граблі. **Г)** на ўвесь мах. **Д)** на сцяну лезці.

---

**16.** Выберыце з дадзеных прыкладаў устойлівае спалучэнне.
*1) хоцькі-няхоцькі; 2) цяп-ляп; 3) хлеб-соль.*
**А)** усе прыклады. **Б)** няма патрэбных прыкладаў. **В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

---

**17.** Як называлася першая сталіца Вялікага Княства Літоўскага?
**А)** Полацк. **Б)** Навагрудак. **В)** Нясвіж. **Г)** Слуцк. **Д)** Тураў.

---

**18.** Якога слова не хапае на месцы пропуску ва ўстойлівым спалучэнні?
*Ісці на свой … .*
**А)** лад. **Б)** луг. **В)** загон. **Г)** хлеб. **Д)** агарод.

---

**19.** Дадзены вершаваныя радкі:
*О мова матчына, пявучая мая!*
*Густая,* ***нібы мёд****, іскрыстая, як сонца…* (Э. Валасевіч).
Выдзеленыя словы з’яўляюцца … .
**А)** зваротkам. **Б)** выклічнікам. **В)** параўнаннем.
**Г)** пабочным словам. **Д)** устаўной канструкцыяй.

---

**20.** Як бярвенне было асноўным будаўнічым матэрыялам хаты, так і … з’яўляліся своеасаблівым будаўнічым матэрыялам унутранай прасторы хаты і духоўнай прасторы сям’і. Іх раней самі ткалі, па-асабліваму вышывалі. Якога слова не хапае на месцы пропуску?
**А)** паясы. **Б)** ручнікі. **В)** палавікі. **Г)** фіранкі. **Д)** адзенне.

---

**21.** Дадзены ўстойлівыя спалучэнні:
*1) збіла з толку; 2) збілася з ног;*
*3) трымала язык за зубамі; 4) пакацілася са смеху.*
Замяніце кожны выраз блізкім па значэнні дзеясловам:
*а) стамілася; б) засмяялася; в) маўчала; г) заблытала.*
**А)** 1-а, 2-б, 3-в, 4-г. **Б)** 1-б, 2-а, 3-г, 4-в. **В)** 1-г, 2-в, 3-а, 4-б.
**Г)** 1-в, 2-г, 3-б, 4-а. **Д)** 1-г, 2-а, 3-в, 4-б.